# Трэція Шчорсаўскія чытанні

***28 мая ў аграгадку Шчорсы, былым уладанні асветніка і гуманіста Яўхіма Храптовіча, прайшлі Трэція Шчорсаўскія чытанні па тэме «Публічныя бібліятэкі на Гродзеншчыне: стан і перспектывы даследавання». Канферэнцыя стала знакавай для Навагрудчыны ў Год культуры, бо мае гістарычны, культурны, нацыянальны прыярытэты. Тэма кнігі і бібліятэкі прайшла чырвонай стужкай праз усё дзейства, што разгортвалася ў Шчорсах. Пачатак чытанняў быў тэатралізаваны і вельмі яркі. Калегам, супрацоўнікам клубных устаноў удалося спалучыць гісторыю, вобразнасць, рыцарскі паядынак і танец вельмі ўдала, каб раскрыць усе каштоўнасці Навагрудчыны. Жыхароў і гасцей Шчорсаў віталі начальнік аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама Марына Шабановіч, намеснік дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага Марына Ігнатовіч, старшыня Шчорсаўскага сельскага Савета Генрых Лукоўскі.***




Паняцці «кніжная культура» і «бібліятэчная вартасць» гучалі з дакладаў навукоўцаў і бібліятэкараў. Вельмі грунтоўнымі былі выступленні калег аб гісторыі бібліятэк Свіслачы, Гродна, Ліды. Як адзначыў у сваім дакладзе кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплінаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Сяргей Амелька, менавіта па ініцыятыве мясцовай інтэлігенцыі ў Беларусі яшчэ ў XIX ст. пачалося стварэнне грамадскіх публічных бібліятэк, якое атрымала больш шырокае распаўсюджванне ў пачатку 1860-х гг. У бібліятэках Гродзеншчыны пераважалі польскія і французскія выданні, набывалася прагрэсіўная для таго часу літаратура. Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. шэраг грамадскіх бібліятэк закрылі. Аднак пад уплывам грамадскасці царскія ўлады вымушаныя былі ў канцы 1860-х гг. пайсці на прадастаўленне некаторых дэмакратычных свабод, у тым ліку адкрыццё публічных бібліятэк.

Найстарэйшай бібліятэкай Беларусі лічыцца Гродзенская абласная бібліятэка. Матэрыялы архіваў сведчаць, што рашэнне аб яе адкрыцці было прынятае ў верасні 1830 г. Першым бібліятэкарам быў прызначаны Міхаіл Зялёнка, прэфект Гродзенскай гімназіі. У 1886 г. пры Гродзенскай публічнай бібліятэцы адкрыўся кабінет для чытання. Цікава, што ў 1892 г. Гродзенскую публічную бібліятэку ўзначаліў бацька Максіма Багдановіча Адам Ягоравіч – вучоны, педагог і грамадскі дзеяч. Намеснік дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі М. Ігнатовіч адзначыла, што бібліятэка прыкладае шмат намаганняў для таго, каб сённяшняму наведніку ў ёй было зручна, цікава і спазнавальна.

Яшчэ адна бібліятэка на Гродзеншчыне мае даўнюю гісторыю, гэта – Свіслацкая раённая бібліятэка. Сёлета ёй спаўняецца 117 гадоў. Рашэнне аб яе адкрыцці было прынятае 30 снежня 1898 г. на валасным сходзе. Карыстанне кнігамі, праца бібліятэкара былі бясплатнымі. Першыя яе чытачы – выкладчыкі, навучэнцы Свіслацкай настаўніцкай семінарыі, сяляне воласці.

А вось у Лідзе першая народная бібліятэка была адкрытая пры чайной (1897). У той час такая з'ява была распаўсюджаная.




Крыніцы аб стварэнні і дзейнасці публічнай бібліятэкі ў Навагрудку вельмі абмежаваныя. Асноўнымі з'яўляюцца ўспаміны і працы ініцыятара яе заснавання Эдварда Паўловіча (1825 – 1909), што быў вядомы як мастак, выкладчык, асветнік, грамадскі дзеяч. Ён у сваёй кнізе «Nowogródek. Wiezienie – wygnanie» (1887) успамінаў: *«мне прыемна паведаміць, што намаганні навагрудчан узняць узровень асветы знайшлі свае выражэнне ў нядаўна адкрытай гімназіі, і, што не менш важна, у бібліятэцы і чытальні, адкрытай на сабраныя ў складчыну сродкі»*.

Ва ўсе часы лёс бібліятэк і кніг заўсёды залежаў ад палітычнага становішча краіны. А на нашых землях у пачатку XX ст. некалькі разоў мянялася ўлада, і кожны раз пакутавалі людзі і кнігі. Бібліятэкі закрывалі, рабавалі, аб'ядноўвалі, кнігі вывозілі, палілі. Бібліятэкі адкрывалі зноў і зноў жа скасоўвалі. Трагічнымі для бібліятэк сталі гады Вялікай Айчыннай вайны. На працягу 1941 – 1944 гг. была страчана большасць дакументаў.

На чытаннях успаміналі вядомых бібліяфілаў, бібліёграфаў, бібліятэказнаўцаў Гродзеншчыны. Мікалай Чарвякоўскі – руплівец, бібліятэкар, якому ўдалося захаваць пэўную колькасць фонду абласной бібліятэкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; Вера Алышава – галоўны бібліёграф краязнаўчага аддзела абласной бібліятэкі, яна першая стала даследаваць гісторыю Гродзенскай абласной бібліятэкі; Мікалай Нікалаеў – загадчык аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, чалавек, які цесна звязаны з Навагрудчынай, займаецца вывучэннем рукапіснай кнігі, даследуе першакрыніцы. Яго праца «Кніга цудаў Наваградскай іконы Багародзіцы як помнік гісторыі XVII стагоддзя» – гэта пераклад выдання са старапольскай мовы, апісанне цудаў, якія здзейсніліся дзякуючы гэтым абразам, і аповед пра Навагрудак таго часу.

Змястоўным і цікавым атрымаўся даклад ураджэнца вёскі Шчорсы Віктара Свёклы, навуковага супрацоўніка Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ён апісаў карціну бібліятэчнага жыцця Гродна 1920-х – 1-й паловы 1940-х гг.

Кожны раз на Шчорсаўскіх чытаннях, і не толькі, адзначаецца, што работнікі бібліятэк – руплівыя даследчыкі, заўзятыя краязнаўцы, крэатыўшчыкі адносна папулярызацыі чытання ў лічбавую эпоху. Аб гэтым яскрава сведчылі шматлікія бібліятэчныя экспазіцыі, якія разгарнуліся для ўдзельнікаў чытанняў. Парад выданняў «Рарытэты з фондаў навагрудскіх бібліятэк» прадставіў каштоўныя выданні: кнігі-гіганты, кнігі-малюткі. У шарэнгу выстраіліся знакавыя кнігі з аўтографамі. Далей заяўлялі аб сабе кнігі, якім больш за 50 і 60 гадоў. Найстарэйшым у фондзе Навагрудскай раённай бібліятэкі лічыцца 13-ы том поўнага збору твораў Льва Талстога, 1913 года выдання.

Адметным атрымаўся музей-стэлаж «Ад чытальні да электроннай бібліятэкі». Тэхнічныя бібліятэчныя сродкі, альбомы, кнігі шрыфтам Брайля, статыстычныя справаздачы, вазок для кніг, першыя інвентарныя кнігі, друкарскія машынкі, дыяпраектары дапамаглі ўзгадаць працу бібліятэкараў у розныя часы. Не пакінуў абыякавым праект «Літаратурны персанаж» і «Музей з куфэрка мінуўшчыны глыбокай» Кміцянскай сельскай бібліятэкі-клуба. У музейным куфэрку захоўваюцца не толькі рэчы і прылады працы, а яшчэ жаночае і мужчынскае адзенне, уласцівае нашай мясцовасці.




***Падрыхтоўка і правядзенне такіх маштабных мерапрыемстваў прадэманстравала работнікам культуры Навагрудчыны тое, што сумесная зладжаная праца без сумневу вядзе да поспеху. Выразную карціну дня завяршыў святочны канцэрт.***

***Галоўнае для нас – зацікавіць наведніка, здзівіць чытача, заахвоціць да чытання і дапамагчы назапасіць ведаў.***

*Ірына ЦАРУК, дырэктар Навагрудскай раённай бібліятэкі*